[ *Стоит отметить, что день ввода в строй модернизированной "Криницы" совпадает с днем рождения А.Лукашенко, которому 30 августа 2003 года исполнится 49 лет.* ]

### "ДАВАЙТЕ ЖИТЬ ДРУЖНО"

Президент Беларуси Александр Лукашенко назвал главную, по его мнению, причину "несуразицы" в белорусско-российских отношениях.

"Главная причина нашей несуразицы в том, что и Лукашенко, и белорусов, не знаю почему, россияне, элита России, часть элиты даже, которая сегодня находится и в руководстве, пытаются выбросить, вытолкнуть из этой России. (...) Такие люди есть и в руководстве, и в политической элите, и в бизнесе. В разное время эти люди превалируют. Вот сегодня не получилось что-то у отдельных компаний в Беларуси, они начинают прессовать президента и Государственную думу, и правительство накануне политических компаний: давайте, вы вот давите на Лукашенко", — заявил белорусский президент.

По словам А.Лукашенко, давить на него "бесперспективно", "потому что у меня своего личного в Беларуси ничего нет. Если бы это были мои предприятия, частные, я бы спокойно, может быть, не только "Челси" покупал, а еще куда-то деньги вкладывал. Но у меня нет предприятий. Это народные, я не могу их за бесценок отдать".

"Сегодня превалируют на политическом поле олигархи. Они начинают "поддавливать" и политиков, и определенных руководителей государства, чтобы они травили Лукашенко. Но я не думаю, что вам надо потерять последнего союзника, после там Казахстана, Украины, Туркменистана еще испортить отношения с Беларусью. Вас не поймут в России. Не делайте это. Давайте жить дружно и на нормальной, цивилизованной основе выстраивать наши отношения", — заявил А.Лукашенко.

**Дмитрий ВЛАСОВ, БелаПАН**

УСПАМІН

# СТАРАЯ ПЕРАВАЛОКА ПАМЯТАЕ МАРШАЛАЎ РАКАСОЎСКАГА І ВАСІЛЕЎСКАГА



*Соф'я Даніловіч (Трафімовіч) стаіць на пярэднім плане са сваімі бацькамі, дзедам і братам, 1938 г.*



*Канстанцін Ракасоўскі*



*Аляксандр Васілеўскі*

**Вёска Старая Пераралока — адна з аддаленых вёсак Слонімскага раёна. Калі прыязджаеш у вёску, з левага боку вуліцы стаіць звычайная старая хата: вокны толькі з усходу, побач невялікія хлявы і ямы ад былых гумна і склепа, ды грушка, якой шмат дзесяткаў гадоў.**

Менавіта ў гэтай хаце ў ліпені 1944 года, калі фронт хутка рухаўся на Захад, спыняліся камандуючы 1-м Беларускім фронтам маршал Канстанцін Ракасоўскі і камандуючы 3-м Беларускім фронтам маршал Аляксандр Васілеўскі. Цяпер гэтая хата пустая, але старэйшыя вяскоўцы яшчэ добра памятаюць вядомых "кватэраздымшчыкаў".

Памятае пра прыезд у Пераралоку маршалаў Ракасоўскага і Васілеўскага і мая бабуля Даніловіч (Трафімовіч) Соф'я Ігнатаўна. Вось пра што яна мне нядаўна расказала.

Бабулі Соні на той час было адзінаццаць гадоў. 11 ліпеня немцы ўжо пакінулі Пераралоку. Але дзяўчынка разам з сям'ёю ў гэтыя дні хавалася ў копках сена, а пасля ў акопах за рэчкаю. На наступны дзень, 12 ліпеня, савецкія войскі змянілі немецкіх і сям'я вярнулася ў хату. Але раніцаю да хаты Ігната Якаўлевіча Трафімовіча (бацька бабы Соні) пад'ехаў легкавы аўтамабіль. Адтуль у суправаджэнні салдат выйшлі два вайскоўцы, на грудзях якіх былі медалі і ордэны. Адзін з іх (як пасля стала вядома — маршал К.К.Ракасоўскі) накіраваўся ў хату Трафімовічаў, а другі — маршал А.М.Васілеўскі — у суседнюю хату.

Сям'ю Трафімовічаў часова папрасілі пакінуць памяшканне. Пасля гэтага ў хату нікога не пускалі, толькі ў каморку, дзе можна было паесці якую-небудзь страву. Таму сям'я з шасці чалавек начавала на склепе, дзе замест ложкаў была салома. Недалёка ад хаты стаяла салдацкая кухня. Таму салдаты час ад часу частавалі сям'ю Трафімовічаў мясам і макаронамі, якіх раней вяскоўцы нават і не бачылі. Блізка ад кухні напагатове знаходзілася "кацюша". А яшчэ, савецкія салдаты падаравалі маці бабулі Соні Марыі Паўлаўне гармонік. Гэты гармонік шмат гадоў захоўваўся ў сям'і Трафімовічаў.

Больш за тыдзень Канстанцін Ракасоўскі і Аляксандр Васілеўскі жылі ў Пераралоцы. Ракасоўскі вельмі рэдка выходзіў на вуліцу, большую частку яго знаходжання займала размова па тэлефоне, які быў прывезены для камандуючага.

Спаў Ракасоўскі на ложку дзеда бабы Соні — Якуба Якаўлевіча. Ахоўвалі яго трое ўзброеных салдат: адзін стаяў каля хаты на вуліцы, другі — у сенцах, а трэці — каля ложка і галінкаю, калі спаў Ракасоўскі, адганяў мух.

Больш за ўсіх даймала маршала маленькая Соня. Калі ў вёску прыйшлі савецкія войскі, салдаты папрасілі ў яе маці малака. Маці наліла ў збанок малака і сказала Соні, каб яна яго аднесла салдатам. За малако вайскоўцы пачаставалі Соню цукеркамі і кавалкамі цукру. Пачастункі дзяўчынка паклала ў спаднічку і прынесла ў хату. Там яна іх схавала і па адной частавалася. Дарэчы, на той час цукеркі ў вёсцы з'яўляліся вельмі рэдкім, каштоўным і смачным ласункам. А калі ў хаце пачаў "кватараваць" Ракасоўскі, Соню ў хату не пусцілі. Яна прасілася ў вартавых пусціць яе, плакала каля дзвярэй, але яе туды ніхто не прапускаў. Гэты плач пачуў Ракасоўскі і загадаў упусціць у памяшканне дзяўчынку, каб яна ўзяла, што хацела. Соня шчаслівая ўвайшла ў сваю хату і забрала ласунак, якім ужо паспелі пачаставацца мышы.

Пра тое, як жылося ў суседняй хаце маршалу Васілеўскаму, на жаль, невядома. Яе маладзейшая гаспадары цяпер жывуць у Рызе, а старэйшыя памерлі.

**Антон ТРАФІМОВІЧ, вучань 10 класа СШ № 9 г.Слоніма**

НАВІНА

## ДЗЯТЛАЎСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА АТРЫМАЛА ПРЭМІЮ

**Дзятлаўская раённая бібліятэка для дзяцей заняла другое месца ў рэспубліканскім конкурсе "Бібліятэка дзецям. Бібліятэка для дзяцей".**

Гэты конкурс праводзілі Міністэрства культуры Беларусі сумесна з Дзіцячым Фондам ААН (ЮНІСЭФ) у Беларусі, Міністэрствам адукацыі і Беларускім Экзархатам.

Бібліятэка ў Дзятлаве атрымала 200 тысяч рублёў прэміі.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

ВЁСКА

## ФАЛЬКЛОРНЫЯ СВЯТЫ АДРАДЖАЮЦЦА Ў ХАДЗЯВІЧАХ

**Цікавасць да нацыянальнай гісторыі і культуры, асабліва да фальклору, традыцыйных абрадаў і святкаванняў праявілася ў жыхароў вёскі Хадзявічы Слонімскага раёна.**

Па ініцыятыве Алы Казора пры сельскім клубе арганізаваны калектыў мастацкай самадзейнасці, які працуе па пэўнай нацыянальнай праграме. Напрыклад, на Вялікдзень тут адбыліся "Вячоркі ў бабулі Ніны". Падчас іх праявядзення гучалі беларускія народныя песні і прыпеўкі ў выкананні Зінаіды Надудзік і Надзеі Рагозік. У праграму гэтага свята былі ўключаны і гумарэскі, анекдоты, замалёўкі, а таксама вершы мясцовых паэтаў Валянціны Ададуравай і Сяргея Чыгрына, маладой паэткі Вольгі Талерчык. Вяскоўцаў пакарылі шасцігадовая спявачка Аксана Давыдзенка і маладыя выканаўцы танцаў Наталля Клыбік і Вольга Талерчык.

Шмат дзесяткаў гадоў у Хадзявічах не адзначалі свята Купалле. І вось сёлета каля вясковага возера сабраліся амаль усе жыхары вёскі. У вазку, прыбраным у нацыянальным стылі, прыехалі дзед і баба разам з унучкай Купалінкай. Ролю дзеда цудоўна выканаў Сяргей Скварцоў — знаўца вуснай народнай творчасці сваёй роднай вёскі. Завіталі на свята таксама Несцерка, лясун, вадзянік, ведзьма, русалкі і мухаморы. Каб пазнаць таямніцы прыроды, быць багатымі і шчаслівымі, маладыя і сталыя хадзяўцы шукалі папараць-кветку, якую пашчасціла знайсці Надзеі Чыгрын. У той вечар вакол кастроў вадзіліся карагоды, праводзіліся розныя конкурсы. Свята доўжылася да ранку.


Вельмі радуе, што адраджэнне беларускіх нацыянальных святаў зацікавіла ўсіх вяскоўцаў. Цяпер людзі самі просяцца запісацца ў наш гурток, бо ўсім надакучыла сядзець па хатах, яны хочуць палюдску адпачываць і весяліцца.

**Ніна КЛЫБІК, кіраўнік гуртка "Спадчына роднага краю" Хадзявіцкага сельскага клуба**

КНІГАРНЯ

## "ПОКА В УСТАХ НЕ СКАМЕНЕЕТ СЛОВО"

**Нядаўна з Кракава атрымаў невялікую бандэрольку. У ёй аказаўся зборнік вершаў маладшага майго сябра-земляка Андрэя Савінкова. Зборнік мае назву "Upiory", што ў перакладзе на беларускую мову адзначае "Вампіры".**




Назва даволі насцярожвае, хаця зборнік вершаў не пра тых мерцвякоў, якія ноччу выходзяць з магілы, каб смактаць кроў людзей. Слова "вампіры" мае, акрамя вышэй названага, яшчэ два значэнні: бязлітасны эксплуататар і крывасмок, а таксама яно азначае род буйных кажаноў. Праўда, на вокладцы кніжачкі вершаў усё ж адлюстраваны здымак старых могілак, адкуль і з'яўляюцца, паводле народных паданняў, "upiory".

Зборнік вершаў Андрэя Савінкова склалі вершы на польскай і рускай мовах. Не кожны радавы чытач гэтую кнігу дачытае да канца, бо над радкамі, строфамі, вершамі паэта трэба думаць пра лёс чалавечы, пра жыццё і смерць, пра тое, што "мой город умер трамвайными рельсами", і пра тое, дзе былі анёлы. Паэт Андрэй Савінкоў — вампір вобразаў і думак, паэт-мадэрніст і філосаф. Прытым, сучасны філосаф са сваімі асабістымі разважаннямі пра наша жыццё, каханне і смерць:

*После остаётся просто*
*Любовь?*
*И в этом я*
*Ничего*
*Не обозначу?*

Мадэрн — тое, што сучаснае і моднае. Можа таму паэт імкнецца ісці ў нагу з часам, жадае быць модным, парушаючы пры гэтым традыцыйныя і класічныя формы верша. Тым не менш, ён суб'ектыўны ў паэтычных вобразах, нехай яшчэ нясмелых і па-юнацку асцярожных:

*В опустевшем доме*
*Сидело нас трое*
*Ты да я и наша*
*Тень.*

Андрэй Савінкоў — малады аўтар, яму толькі 26. Адчуваецца, што паэта зацікавіла еўрапейская культура. Тут ён адчувае сябе вольна і незалежна, ён мудра філасофствуе, разважае, "как настоящий поэт", які блукае "по старому городу до смерти озябшему в багряной плащанице, трижды убитый и четырежды воскресший...". Але аўтар зборніка "Upiory" па-свойму задуменны і самотны. І гэтая самотнасць адчуваецца ў польскіх і рускіх вершах. Ды паэт не зважае на гэта, ён творыць і жыве словам:

*Живу пока*
*В устах не скаменеет*
*Слово*
*А слово было так себе*
*От Бога...*

Чытаючы зборнік вершаў Андрэя Савінкова, мне чамусьці прыгадваюцца нашы беларускія літаратары, якія жывуць, пішуць і друкуюцца ў Польшчы. Здаецца, малады слонімскі аўтар далучыцца да моцных паэтаў Яна Чыквіна, Надзеі Артымовіч, Міры Лукшы, Юркі Баена, якіх цікавіць у паэзіі міг быцця і вобраз. Ёсць нешта ў маладога Савінкова ад польскіх Казімежа Свягоцкага і Тадэвуша Ружэвіча.

Яго своеасаблівыя паэтычныя радкі, як і вершы названых паэтаў, кранаюць чалавечую экзістэнцыю глыбокай вобразнасцю і роздумам:

*Smierc*
*Pachnie czystum*
*Przescieradlem*
*Wieczornym*
*Chlodem koldry*
*Tuli sie do nog*
*Zmeczonym psem...*

Нагадаю яшчэ, што паэт Андрэй Савінкоў нарадзіўся ў Слоніме. Цяпер ён студэнт факультэта паланістыкі і культуралогіі Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

НАВЕЛА

# КАРАЛЕЎСТВА ЧЫРВОНАЙ РУЖЫ

Вячэрняя зара трымала на сваіх пяшчотных далонях сонца і паволі апускала яго за гарызонт. Дзень змяняўся вечарам, і кветкі ў агародчыку Кацярыны Данільчык рэагавалі на гэта кожная па-свойму. Ліловыя Званочкі апусцілі свае галоўкі: ім хацелася спаць. З высокай акуратнай лесвіцы, што паднялася ледзь не да самай страхі прыгожа ашаляванага дома, на іх строга зірнула Каралева агародчыка Чырвоная Ружа:

— А гэта што такое?! Сонца не зайшло, а яны ўжо дрэмлюць, — пачала яна дакараць Ліловыя Званочкі. — Цётачка Півоня, вы там бліжэй, раскатурхайце гэтых гультаёў. Людзі яшчэ на вуліцы ходзяць, мы павінны ствараць для іх прыгажосць.

Старая Півоня махнула галінкамі, і маленькія рупарчыкі пачалі падымацца ўгору.

— Мы дык не спім ні ўдзень, ні ноччу, — пахваліліся Белыя Рамонкі. — Круглыя суткі нясём дзяжурства ў агародчыку, стараемся, каб усюды было прыгожа.

— Падумаеш, яны не спяць, — зашапатаў доўгімі вузкімі лісткамі цыбаты Гладыёлус. — Я, як расцвіту, таксама не буду спаць.

— Вось тады і скажаш, а пакуль што ты яшчэ зусім зялёны, — перапыніла спрэчку Чырвоная Ружа.

— Нешта нашы Клеманцысы зусім кволыя, — латвей уладкоўваючыся на градзе, прамовіла Півоня.

— А што вы хочаце, цётачка, — заступілася за Клеманцысы Чырвоная Ружа. — Гаспадыня толькі сёлета іх пасадзіла. Калі крышку падраслі, гаспадар, Сяргей Яўгенавіч, зрабіў акуратненькія лесвічкі, каб яны таксама, як і я, пяляся ўгору. Гэтыя кветкі шматгадовыя, вельмі прыгожыя. Да жніўня яны заплятуць усю сцяну і зацвітуць бардовым, бэзавым і ружовым цветам.


— А мне дык вельмі падабаецца мая суседка Ружовая Ружа, — гучна прашатаў Белай Флоксе стары Цюльпан. — Шкада, што я ўжо даўно адцвіў і засох, а Ружачка такая прыгожанькая, — цяжка ўздыхнуў ён. — Вось каб нам пасябраваць...

— І слухаць не хачу! — капрызна страсянула дробненькімі кветачкамі Ружовая Ружа. — Вакол растуць такія чароўныя Хрызантэмы! Яны яшчэ не зацвілі, а ты, дзед Цюльпан, ужо даўно асыпаўся. Ловіш розніцу?

— Не зазнавайся, Ружовая Ружа, — памяркоўна прапанавала тоўстая Белая Флокса, якая не сёння-заўтра павінна была зацвісці пахучымі кветкамі. — Усё мяняецца: пакуль Хрызантэмы расцвітуць, ты сама ўжо асыплешся, і яны будуць глядзець на цябе з такой жа пагардай, як ты цяпер на Цюльпан.

— Ну і няхай! — незалюбіла Ружовая Ружа і павярнула свае прыгожыя кветачкі да Зялёнага Мірта.

— Не сумуй, Ружачка, я заўсёды буду з табой, — падміргнуў стары лавелас. Ён цвіў у агародчыку з вясны да восені і таму добра ведаў усе кветкі і пра кожную меў сваё меркаванне.


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Чырвоненькія Цыніі — прыгожыя і сціплыя — аб нечым шапталіся з Вяргіняй, што важна расселася побач.

— Пра што вы там? — пацікавілася Чырвоная Ружа. — Гаварыце ўслых, каб усе чулі. У нас тут ніякіх сакрэтаў быць не павінна.

— Яны кажуць, што нам вельмі пашанцавала з гаспадарамі, — важна паведаміла Вяргіня.

— Ну, гэта ні для каго не сакрэт, — згадзілася Чырвоная Ружа. — Такіх гаспадароў, як нашы Данільчыкі, мала не толькі на вуліцы Кастрычніцкай, але і ва ўсім Дзятлаве. Кацярына Мікалаеўна, нягледзячы на шаноўны ўзрост, трымае ў вялікім парадку і дом, і агарод. А з якім клопатам яна даглядае нас! І пустазелле ніколі нас не глушыць, і паліты, падкормлены своечасова.

— Я дык вельмі ўдзячны гаспадару Сяргею Яўгенавічу, што зрабіў для мяне такую цудоўную лесвічку, — прамовіла Ружовая Ружа. — На ёй так зручна! І відаць далёка.

— А я чуў, як гаспадыня расказвала адной знаёмай, што Сяргей Яўгенавіч усё ўмее і ўсё любіць рабіць. Яму ўжо няшмат засталося да сямідзесяцігоддзя, а ні хвілінкі не пасядзіць склаўшы рукі: то мэблю робіць, то нешта рамантуе. А як цудоўна ён ашаляваў дом! — захапляўся Мірт.

— Ага, ва ўсім Дзятлаве ніхто так ашаляваць не можа! — з гордасцю прамовіла Чырвоная Ружа. — Гэта яны аднойчы ездзілі ў Малдавію, і там зусім чужы чалавек, таксіст, прапанаваў паглядзець, дзе нарадзілася знакамітая спявачка Сафія Ратару. Дом яе бацькоў ашаляваны надзвычай прыгожа. "І я так свой ашалюю", — паабяцаў жонцы Сяргей Яўгенавіч. І, бачыце, зрабіў. Ашаляваў і балкон і прымацаваў да яго два цудоўныя ліхтарыкі.

— У нашых гаспадароў і дзеці такія ж акуратныя ды дбайныя: што сын, што дачка, — пахваліла тоўстая Флокса. — Як прыедуць у госці да бацькоў, то ўсё нешта стараюцца дапамагчы.

— Я са сваёй лесвіцы надта люблю назіраць, калі іхні сын прыязджае дадому ў вайсковай форме. Яго пагоны падпалкоўніка так хораша зіхацяць на сонцы! — парадавалася Чырвоная Ружа.

— Мне і ўнукі гаспадароў падабаюцца, — падтрымала гутарку старая Півоня. — У вялікіх гарадах на асфальце выраслі, а любяць прыроду. Ніколі нас не крыўдзяць.Я ж вясной рана зацвітаю, то падыдуць блізенька, панюхаюць пахучыя кветкі, але не рвуць. Хочуць, каб усім было прыгожа.

...Сонца ўжо даўно схавалася за гарызонт. Патухла вячэрняя зара. Трэці сон бачылі Ліловыя Званочкі, хіліла да сну стары Цюльпан, а каралева Чырвоная Ружа з бліжэйшымі суседкамі ўсё гаварыла пра сваіх цудоўных гаспадароў, дзякуючы якім яны жывуць тут дружнай сям'ёй на радасць усім людзям.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ**

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## КВАТАРАНТКА

Хата цёткі Марылі была апошняй у вёсцы. З трох бакоў яе акружаў лес. У сонечны зімовы дзень мы з цёткай сядзелі ля акна і назіралі, як слаўна ўпрыгожыў мароз старыя бярозы за плотам: яны скрозь былі пакрыты інеем — пушыстым, белым, нібы лебядзіны пух. Калі вецер чуць варушыў галіны, іней пераліваўся на сонцы мноствам брыльянтаў.

Раптам са шпакоўні, што вісела на бярозе, высунулася вавёрчына галоўка.

— Гляньце, у шпакоўні жыве звярок! — здзівілася я.

— Ужо не першы год птушкі на зіму пускаюць у свой домік гэту рыжую кватарантку. Як толькі восенню яны палятуць у вырай, вавёрка адразу ж засяляецца ў шпакоўню і жыве тут гаспадыняй да самай вясны. Каб ты бачыла, як старанна яна цягае сюды розныя шышкі, арэхі, што назапасіла за лета і схавала ў нейкім дупле. Усё роўна як чалавек перабіраецца на другую кватэру.

Тым часам вавёрка вышмыгнула са шпакоўні, спусцілася па тоўстым ствале і схавалася недзе ў кустах. Толькі і мільгануў на сонцы яе рыжы пушысты хвосцік.

— Бачыш ты, зіма, холад, а ў яе нейкія свае клопаты, — задумліва прамовіла цётка Марыля, латвей захутваючыся ў пуховую хустку. — Ніхто не можа пражыць на свеце без турбот: ні звер, ні птушка, ні чалавек...

## БРЫДКАЕ БУСЛЯНЯ

На сядзібе бабулі Сцепаніды Аўсянай, што жыла на Савелаўскім хутары, была старая буслянка. Уласна кажучы, і не хутар гэта быў, а проста на водшыбе вёскі стаяла яе хата, адгароджаная ад усіх іншых калгасным садам. Буслы даўно аблюбавалі сабе для жытла стары дуб, у які некалі ўдарыў пярун. Дрэва пашчапалася і пачало сохнуць, а да яго невядома чаму сталі лятаць буслы.

— Татка, зрабі на дубе буслянку, — папрасіў аднойчы маленькі Міша, які ў той год павінен быў пайсці ў першы клас. — Няхай бы гэтыя птушкі ў нас жылі, а то як спілуеш дрэва, у нас будзе вельмі сумна.

Сцепанідзін муж, Ігнат, зрабіў так, як прасіў сын: ён усцягнуў на дрэва старую барану, наклаў на яе галля. Астатняе дарабілі буслы на свой густ.

Недзе праз год Ігната прыбіла ў лесе дрэвам, і ён, праляжаўшы ў бальніцы два тыдні, памёр, але пакінуў пра сябе добрую памяць. Сцепаніда на першым часе не магла спакойна глядзець на буслянку: зірне — і плача, мужа ўспомніўшы. Сумаваў і Міша, але дзіцячая памяць кароткая, як цень у поўдзень. Праз некалькі гадоў Міша стаў высокім, цыбатым, нібыта бусел. Ён быў аматар на ўсякія выдумкі, за што часта атрымліваў ад маці нагоняй. І вось аднойчы яны з Віцем Маліноўчам — аднагодкам і такім жа выдумшчыкам — узлезлі вясной на пашчапаны дуб і паклалі да бусліных яек гусінае — ужо крышку заседжанае, выцягнутае проста з-пад гускі, якая выводзіла патомства. Хлопцам надта ж цікава было: прымуць буслы яйко ці выкінуць з гнязда? Яны кожны дзень лазілі пад дрэвам, правяраючы, ці няма тут яйка, тапталі траву, якую Сцепаніда збіралася касіць для казы. Ёй было незразумела, чаго падлеткі шныраць пад дрэвам. А яны не прызнаваліся.

Як у буслянцы запішчалі малыя бусляняты, Міша з Віцем падвоілі пільнасць: калі разам з імі з'явіцца на свет гусяня, то яму, напэўна, месца ў гняздзе не знойдзецца.

Праз некаторы час хлопцы і цётка Сцепаніда заўважылі, што да іхняй сядзібы злятаюцца буслы з усёй ваколіцы. Пакружаць над гняздом, потым сядуць на сухіх дубовых галінах і аб нечым гучна клякочуць.

— І што ім так падабаецца? — не разумела Сцепаніда. — Проста статкамі лётаюць.

Якое ж было ў людзей здзіўленне, калі аднойчы да гнязда невядома адкуль прыляцеў чорны бусел. Ён таксама пакружыў і сеў на дуб. Клёкат разносіўся па ўсёй ваколіцы.

— Нараду праводзяць, — прашаптаў Міша Віцю ціхенька, каб не чула маці. Яна, не далічыўшыся пад гускай аднаго яйка, западозрыла хлопцаў. Нават допыт наладзіла, але нічога не дабілася.

— Ага, — згадзіўся той. — Раяцца, мусіць, што рабіць з гусянём. Рашэнне чорнага бусла будзе канчатковым, бо ён, відаць, у іх вялікі аўтарытэт.

Да таго часу трава пад дубам была скошана і падсушана, складзена ў капу. Аднойчы сонечнай летняй раніцай Сцепаніда выйшла на лужок, каб растрэсці траву і канчаткова яе высушыць. Толькі падыйшла да капы, як з дрэва раптам упала гусяня. Яно пляснулася на капу і таму не разбілася, нават не пакалечылася. Кабета ажно падскочыла ад нечаканасці.

— Яйко гусінае з неба ўпала, тое, што некалі знікла, і ты па ім ледзь не плакала, — патлумачыў Міша, які сядзеў на ганку і рабіў з дрэва свісток. Ён падбег да капы, узяў гусяня. Яно было ўжо не зусім малое, але ж надта кволенькае. Мусіць бусліная яда не ішла на карысць.

— Гэта ты, свавольнік, падсунуў буслам гусінае яйко?! — здагадалася Сцепаніда.

— Ну, — згадзіўся Міша. — Каб ведаў, то і больш падсунуў бы. Бачыш, гатовыя гусяняты з дуба падаюць. Давай на наступны год так і зробім.

— Я табе зраблю! — прыгразіла маці. — Добра, што не разбілася, бедненькае, — забрала яна ў Мішы птушанятка. — Цяпер невядома, ці прыме яго гуска?

— О, цяпер да нас будуць з усёй ваколіцы ісці гусі на нараду: што рабіць з гусянём — прымаць ці не прымаць. Буслы ж дзеля гэтага сюды ляталі.

— І праўда, дзеля гэтага! А я думаю, чаго ім тут трэба? — у роздуме прамовіла Сцепаніда. — Гусі не пойдуць. Яны дурнейшыя. А бусел — разумная птушка.

... Недзе ў Расіі жыве Міша Аўсяны. Ён стаў лётчыкам. Мінулай зімой, пакуль бабуля Сцепаніда ў яго гасціла, вясковыя выпівохі спілавалі дуб і загналі некаму на дровы. Разбурылі буслянку, а новую не зрабілі. Сумуе цяпер старая Сцепаніда: пуста стала на сядзібе. А былі буслы — было жыццё.

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ**

КАНИКУЛЫ

# ПОДРУЖИЛИСЬ ТУРИСТЫ И КАРАТИСТЫ

**Веселым концертом завершилась вторая смена в детском туристическом лагере «Глобус» в Шиловичах. Но не только юные туристы Слонима и Слонимского района хорошо отдохнули за эти три последние летние недели. Компанию любителям путешествий составили каратисты из клуба «Барс».**

Ребята нашли общие интересы, и время пролетело незаметно. Разъезжаться по домам к концу смены не хотелось никому. Еще бы, ведь столько всего интересного происходило в лагере. Это и игра "Зарница", и экзотический для нас хоккей на траве по собственным правилам, и водные походы на туристических байдарках, и, конечно же, тренировки в туристических дисциплинах и по каратэ. Причем, каратисты с удовольствием учились вязать узлы и преодолевать навесную переправу, а туристы знакомились с эффективными приемами самообороны. А уж какой отдых без дискотек? И их тоже было достаточно.

Свои собственные таланты нашлись и среди ребят. Сочинить слова к юморной песне о жизни в лагере — пожалуйста, придумать забавные миниатюры об особенностях национальных туалетов — нет проблем. А исполнение народных мелодий на баяне и аккордеоне братьями Гончарук с подтанцовкой Игорька — это просто умора, иначе и не скажешь.


Так что отдохнули ребята на славу, несмотря на не всегда дружелюбную июльскую погоду, которая частенько загоняла всех под крышу.

**Валерий КОВАЛЕНКО**



Фота Аляксандра НІЧЫПАРА

*"Зарница": с того берега вернулись с "трофеями"*



Фота Віталя ГІЛЯ

*Эти девчонки за себя постоять сумеют*



Фота Аляксандра НІЧЫПАРА

*Не страшна нам высота*

ФУТБОЛ

## ЗГУЛЯЛІ, ЯК МАГЛІ

**У чарговым матчы першынства Беларусі па футболу мастоўскі "Нёман" прымаў рагачоўскі "Днепр".**

Каманды займаюць суседнія радкі ў другой палове турнірнай табліцы. Магчыма гэта і паслужыла прычынаю блёклай гульні.

Напачатку госці спрабавалі наладзіць атакуючы футбол, але гэта ім не ўдавалася. Усю першую палову гульні каманды перакідвалі мяч ад адных варотаў да другіх. На 13-й хвіліне сустрэчы гасцям удаецца адзіная атака, і яны забіваюць гол у вароты гаспадароў поля. Аднак тут жа, у адказ, праз хвіліну Дзмітрый Руцько забівае гол.

У другой палове гульні ўжо мастаўчане імкнуцца наладзіць гульню ў атацы і большую частку тайма праводзяць на палове поля саперніка. Але мастаўчанам не заўсёды хапала хуткасці і майстэрства. Атакі праводзіліся аднастайныя — па цэнтру поля, і іх спыняць рагачоўцам было не цяжка.

У чарговы раз даводзіцца канстатаваць, што гаспадары поля не праяўляюць волі да перамогі, і таму, як вынік, яшчэ адна нічыя, на гэты раз з лікам 1:1.

**Язэп ПАЛУБЯТКА**

КАНИКУЛЫ

# ГРЕБЦЫ — НА ЩАРЕ, ФУТБОЛИСТЫ — НА МОРЕ



Фота Віталя ГІЛЯ

*Будущее слонимской школы гребли и летом старается быть вместе*

**Не теряют даром летние деньки слонимские гребцы. Каждое лето при СДЮШОР №2 организуются спортивные лагеря, в которых помимо отдыха ребята продолжают тренироваться и попутно участвуют в республиканских соревнованиях.**

В этом году в первой смене (дневное пребывание) спортлагеря «Водник» было 100 человек, а во второй смене (круглосуточная) — 50 ребят.

А вот юные футболисты слонимской ДЮСШ №1 уже второй год подряд ездят на Украину в Херсонскую область, где в поселке Хорлы располагается база отдыха грузового автопарка №11.

Как сказал тренер слонимчан Виктор Асаевич (вторым воспитателем ездил тренер Юрий Данилевич), ребята прекрасно отдохнули, вволю накупались в лимане, до отвала наелись фруктов.

А кроме этого еще провели несколько товарищеских матчей с футболистами из Белой Церкви, Киева, с российскими сверстниками и местными ребятами.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

ПРЕДСТАВЛЯЕМ СОПЕРНИКА

## ВСТРЕЧА НА ЭКВАТОРЕ ЧЕМПИОНАТА

**В четверг, 24 июля, слонимский «Коммунальник» в последнем матче первого круга на своем поле будет принимать одного из лидеров чемпионата — гомельский ЗЛиН.**

Баланс предыдущих встреч команд: 12 игр, +5=2-5, мячи 18:15 (в Слониме — 6 встреч, +4=2-0, мячи 15:2.

Бомбардиры:Ю. Данилевич – 4; В. Покаташкин – 4.

Самая крупная победа «Коммунальника» — 9:1 (Слоним, 19.06.1994 г.). Самые крупные поражения — 0:3 (Гомель,16.06.1999 г.; Гомель, 26.05.2001 г.).

Гомельский клуб основан в 1989 году. В чемпионатах Беларуси выступает с 1992 г. В первой лиге играет с сезона 1992/93 (кроме 1995 – 97 годов). В 250 матчах +93=59-98, мячи 314 – 319. Лучшее место — 6-е (1992/93 годов), худшее — 14-е (1994/95 годы).

В этом сезоне ЗЛиН показывает добротную игру и главный тренер команды Николай Петрович Литвинов (15.12. 1949 г.р.) может со своими подопечными занять по итогам первенства рекордно высокое для команды место. В коллективе собраны опытные игроки.

Ворота бессменно защищает Владимир Рыженко (32 года; 59 игр в лиге, пропустил 49 мячей).Среди полевых игроков опыт выступления в высшей лиге имеют Александр Савельев (31; 36 матчей, забил 16 голов), Федор Лузай (28; 118, 5), Василий Дроздов (28; 75, 2), Вячеслав Канус (29; 251, 1),Владимир Покаташкин (32; 257, 79), Олег Сысоев (35; 28, 3), Юрий Чумаков (29; 156, 3), Андрей Удодов (22; 64, 20), воспитанник слонимского футбола Дмитрий Троско (33; 37, 2).

В соотношениях встреч соперников равновесие. Но на своем поле «Коммунальник» ЗЛиНу пока еще не проигрывал.

Матч состоится на стадионе «Юность» и начнется в **18.00**.

**Александр ЗАХАРЕНКО**

ФУТБОЛ

## ОДОБРЕНА РЕФОРМА ПРОВЕДЕНИЯ КУБКА УЕФА

**УЕФА решился на изменение формата второго по престижности клубного турнира Европы — Кубка УЕФА. Новая схема будет введена с сезона–2004/05 годов.**

С начала сезона-2004/05 турнир будет проводиться по следующей схеме. В первой фазе на выбывание примут участие 80 команд. Сорок лучших попадут в групповой турнир и составят восемь групп по пять клубов в каждой.

Двадцать четыре команды пройдут дальше — в стадию плей-офф, где к ним присоединятся 8 клубов, вылетевших из Лиги чемпионов.

**news.sport-express.ru**

ФУТБОЛ. ПЕРВЕНСТВО ОБЛАСТИ

# ВЫМУЧЕННАЯ ПОБЕДА




*Свои ворота слонимчане всё же отстояли*

**ФК «СЛОНИМ» — «ХИМИК» (ГРОДНО), 1:0 (0:0)**

**19 июля. Слоним. Стадион «Динамо». 100 зрителей.**

**Судья:** Г. Вербицкий (Слоним).
**ФК «Слоним»:** Берг, Добриян, Семенов (К), Ботик, Снопко, В. Дегиль, А. Дегиль, Рудько (88,Молчанов), Ничипорович (82,Захожевский), Позняк, Куцко (73,Сивоха).
**Гол:** Куцко (61).




*Вратарь Берг сыграл надёжно*

В областном первенстве состоялся центральный матч тура. В Слоним на игру с лидером чемпионата приехала третья команда Гродненщины.

Игра началась осторожно, команды на первых порах присматривались друг к другу. Скорости у футболистов были небольшие, сказывалась жара.

Тем не менее, игроки обеих коллективов пытались сыграть комбинационно. У хозяев поля атаки строились по флангам через братьев Дегилей. У гостей выделялся активностью поигравший не один сезон за «Коммунальник» Олег Савицкий.

В первом тайме упорная борьба результата не принесла. А на 16-й минуте второй половины встречи в ходе очередной атаки слонимчан в сутолоке у ворот "химиков" первым у мяча оказался Денис Куцко.

Минимальное преимущество было шатким, и хозяева пытались увеличить разрыв в счете. Так же как и гости, стремившиеся сравнять результат. На 88-й минуте наши игроки забивают второй гол, но судья на линии определяет офсайд, и главный арбитр матча Г. Вербицкий отменяет взятие ворот.

В итоге матч закончился с минимальным перевесом слонимчан (1:0) и оставил их во главе турнирной таблицы.

**Александр ЗАХАРЕНКО**

**УТОЧНЕНИЕ**

В матче "Волна" (Зельва) — ФК "Слоним" хозяевам поля решением областной федерации футбола было засчитано техническое поражение 0:3, так как в составе команды были заиграны не заявленные на чемпионат футболисты (реальный счет матча, до опротестования, — 3:3).

ХОККЕЙ

# СБОРНАЯ БЕЛАРУСИ ПОБОРЕТСЯ ЗА "КУБОК "СПАРТАКА"

**Сборная Беларуси по хоккею примет участие в X международном турнире "Кубок "Спартака", который пройдет в Москве с 18 по 23 августа.**

Белорусы попали в предварительную группу "А" вместе со сборной Украины и московскими клубами "Спартак" и ЦСКА.

В группе "Б" сыграют "Крылья Советов" (Москва), "Северсталь" (Череповец), финский ХИФК и сборная Латвии.

В полуфинал выходят две лучшие команды каждой группы.

Турнир был учрежден выдающимся советским хоккеистом Вячеславом Фетисовым, который ныне является председателем Государственного комитета России по физической культуре и спорту.

**Дмитрий ВЛАСОВ**

ШАХМАТЫ

# ЖУРНАЛ «ШАХМАТЫ» ОБЕЩАЕТ БЫТЬ ИНТЕРЕСНЫМ

**Увидел свет первый номер белорусского информационно-просветительского журнала "Шахматы", отпечатанного тиражом в 700 экземпляров, который издается на белорусском и русском языках.**

По словам директора издательства "Адукацыя і выхаванне" Николая Супрановича, журнал стал 26-м периодическим изданием предприятия.

Первый номер "Шахмат" объемом в 48 страниц и стоимостью примерно 1.500 рублей будет распространяться предприятиями розничной торговли.

"Мы надеемся, что с течением времени издание станет ежемесячным и будет выходить на 64 страницах", — сказал Н. Супранович.

Во вступительном слове редакции журнала говорится, что особое внимание в издании будет уделяться развитию детских и юношеских шахмат в Беларуси. Редакция планирует ввести рубрики "Регион" и "Зарубежный опыт", наладить постоянные связи с шахматистами мира, рассказать о необычных для Беларуси видах шахмат (гексогональных и сёги), а также подготовить тематические выпуски, посвященные отдельным шахматистам или событиям.

Как сообщил БелаПАН главный редактор журнала Владимир Рубинчик, в последующих номерах издания будут опубликованы материалы о вице-чемпионе мира по шахматам среди юношей Сергее Азарове, значении шахмат в жизни и творчестве белорусских писателей, судьбе белорусских шахматистов в США, а также статьи об этюдных окончаниях, искусстве композиции и информация из регионов страны.

Причем, по словам В. Рубинчика, с октября нынешнего года на журнал будет объявлена подписка.

**Марат ГОРЕВОЙ**

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

# ДАЦЬ БОЙ МІНЧАНАМ НЕ ЗДОЛЕЛІ

**МТЗ-РЫПО (МІНСК) — "КАМУНАЛЬНІК" (СЛОНІМ), 4:0**

**20 ліпеня (нядзеля). Мінск. Стадыён "Трактар". 1 000 гледачоў.**

**Суддзя:** М. Архіпаў (Жодзіна).
**"Камунальнік":** Канашэвіч, Скляр, Вольскі, Горбач, Плют, Зюлеў (46, Варанцоў), Срыбненка, Астапчык, Яўсеенка, Аначэнка (К) (46, Місюк), Цыганенка (72, Цішчанка).
**Галы:** Петруковіч, 11, 17; Кузьмянок, 57; Яўсейчык, 83.
Папярэджанні: Варанцоў (59), Цішчанка (77), Мальцаў (86) (усе — за брудную гульню).

Каментарый галоўнага трэнера "Камунальніка" Барыса Лазарчыка:

— У сталіцу дабіраліся з прыгодамі — па дарозе зламаўся аўтобус. Тяжкая дарога не магла не адбіцца на дзеяннях нашых футбалістаў, у дадатак паўплывала спёка. Не дзіўна, што многія хлопцы, якія, здавалася, нядрэнна падрыхтаваны фізічна, сёння "сталі". Таму і не было камбінацыйнай гульні. Да і сапернік, трэба адзначыць, выглядаў здорава.

Але калі наладзіць арганізацыю справу у клубе на добрым узроўні, мы здолеем згуляць на роўных і з такімі камандамі, як МТЗ-РЫПО.

**Пётр ЗАЯЦ, (ВоФ)**

**ВЫНІКІ АСТАТНІХ МАТЧАЎ 14-ГА ТУРА:**

| | |
|---|---|
| ЗЛіН — Граніт, | 0:2 |
| Пінск-900 — Ведрыч-97, | 0:5 |
| Бяроза — Лакаматыў, | 0:0 |
| Нёман — Днепр-ДЮСШ-1, | 1:1 |
| Ліда — Смаргонь, | 1:2 |
| Хімік — Тарпеда-Кадзіна, | 1:0 |
| Вертыкаль — Дынама-Юні, | 1:3 |

**Турнірная табліца пасля 14-га тура**

| | гульні | В | Н | П | ачкі | мячы |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. МТЗ-РЫПО | 14 | 10 | 1 | 3 | 31 | 29-8 |
| 2. Лакаматыў | 14 | 9 | 3 | 2 | 30 | 24-10 |
| 3. ЗЛіН | 14 | 8 | 3 | 3 | 27 | 23-12 |
| 4. Хімік | 14 | 8 | 3 | 3 | 27 | 20-16 |
| 5. Граніт | 14 | 7 | 5 | 2 | 26 | 17-8 |
| 6. Смаргонь | 14 | 7 | 2 | 5 | 23 | 21-10 |
| 7. Ліда | 14 | 7 | 2 | 5 | 23 | 24-15 |
| 8. Ведрыч-97 | 14 | 6 | 3 | 5 | 21 | 22-14 |
| 9. Камунальнік | 14 | 5 | 5 | 4 | 20 | 16-17 |
| 10. Вертыкаль | 14 | 4 | 2 | 8 | 14 | 10-19 |
| 11. Нёман | 14 | 4 | 2 | 8 | 14 | 16-25 |
| 12. Тарпеда-Кадзіна | 14 | 3 | 5 | 6 | 14 | 13-17 |
| 13. Днепр-ДЮСШ-1 | 14 | 3 | 4 | 7 | 13 | 9-21 |
| 14. Дынама-Юні | 14 | 4 | 0 | 10 | 12 | 18-35 |
| 15. Бяроза | 14 | 3 | 3 | 8 | 12 | 9-23 |
| 16. Пінск-900 | 14 | 2 | 1 | 11 | 7 | 10-31 |

ГРЕБЛЯ

# ВТОРОЕ МЕСТО — ЭТО УСПЕХ




*Вячеслав Бонда, Елена Рогач и Василий Меркун*

**Немногочисленный, но сильный состав гребцов выставила Слонимская спортивная детско-юношеская школа олимпийского резерва №2 на республиканскую спартакиаду учащейся молодежи, которая прошла 18-20 июля в Минске.**

Среди двенадцати команд-участниц, слонимчане заняли второе общекомандное место. А самый весомый вклад в этот, безусловно, хороший результат внесли четверо наших гребцов, ставших победителями и вошедших в тройку призеров.

Так, Василий Меркун (СШ №5) в байдарке-двойке дважды побеждал — на дистанциях 500 и 1 000 метров — и еще раз в байдарке-одиночке в эстафете 4 по 500 м занял третье место. Елена Рогач (УОР) в байдарке-одиночке пришла второй к финишу на дистанции 500 м, в байдарке-двойке заняла третье место на 500-метровке. Также второе место Елена заняла в составе эстафетной команды 4 Х 500 м.

Дважды третьими становились Вячеслав Бонда и Юрий Русенко (оба — СШ №10): сначала в байдарке-двойке на 500-метровке, а после в байдарках-одиночках в эстафетной гонке на полукилометровой дистанции.

Готовили команду к соревнованиям В. Лойко и М. Миронов.

**Валерий КОВАЛЕНКО**

ИСКУССТВО

# ЖИВОПИСЬ СЕРДЦА

**19 июля в Слонимском краеведческом музее состоялось открытие выставки картин молодого слонимского художника Дмитрия Полуносика. Слонимчане впервые знакомятся с творчеством своего земляка, и, хочется надеяться, оно станет настоящим открытием для жителей города.**


Год назад Дмитрий Полуносик закончил Минское художественное училище им.Глебова. Художник принимал участие в выставках «Новые имена» (Минск), «Арт-сессия» (Витебск), «Выставка в поддержку весны» (Санкт-Петербург). Дмитрий имел персональную выставку в Минском художественном училище, а также участвовал в ряде творческих акций. Надо сказать, что такая акция как «Первая международная выставка для птиц», проведённая художникам в апреле этого года, не имела аналогов в мире.

Дмитрий работает в различных стилях и направлениях. Среди работ, представленных на выставке в музее, вы найдёте портреты, пейзажи, натюрморты, композиции, подсказанные безграничной фантазией художника. Многоплановость в творчестве позволяет художнику найти своих почитателей и среди искушённой публики, и среди людей, далёких от искусства, но умеющих сердцем чувствовать прекрасное.


Думается, что основная особенность работ Дмитрия — их необыкновенная искренность и открытость. Каждый мазок кисти, как нота. Он может звучать как верно, так и фальшиво. Умение взять верную ноту дано не каждому художнику.

Иногда полотна высокопрофессиональных мастеров могут издавать отвратительный скрежет фальши. Напротив, всегда чиста и светла мелодия детского рисунка. Не всегда светла, порою пронзительно печальна, но всегда чиста и точна мелодия полотен Дмитрия Полуносика. Его живопись — это живопись сердца.

**Светлана БЕНЬ,**
**студентка Белорусской академии искусств**



*Слонимский художник Дмитрий Полуносик*



Фота Віталя ГІЛЯ

*Одна из работ Дмитрия Полуносика. (Без названия)*



Фота Віталя ГІЛЯ

*Часть экспозиции выставки*



СЛОНІМ. НАШЫ ЛЮДЗІ

Фота Віталя ГІЛЯ

*Стаяць спякотныя дні*





Фота Віталя ГІЛЯ

## ПРОГНОЗ ПОГОДЫ
по Гродненской области

**23 июля:**

Шторм, облачно с прояснениями, на большей части территории кратковременные дожди, грозы, днем в отдельных районах сильные ливни, ветер юго-восточный 4-9, днем при грозе местами шквалистое усиление до 15-20 м/с. Температура воздуха ночью +15+20, днем +23+28.

**24-25 июля:**

Переменная облачность, преимущественно без осадков, лишь ночью 24 июля местами кратковременные дожди, грозы, ветер западный 5-10 м/с, температура воздуха 24 июля ночью +14+19, днем +23+28.25 июля ночью +15+20, днем +26+31.

Информацию предоставил Гродноблгидрометеоцентр



**Газета Слонімская**

Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.

ЗАСНАВАЛЬНІК
**Віктар ВАЛАДАШЧУК**
ВЫДАВЕЦ
**УП "ГАЗЕТА СЛОНІМСКАЯ"**

**ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР**
Віктар ВАЛАДАШЧУК
**НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА**
Сяргей ЧЫГРЫН
**АДКАЗНЫ САКРАТАР**
Мікола КАНАНОВІЧ
**ЖУРНАЛІСТЫ**
Вольга ШЫНКЕВІЧ
Валерый КАВАЛЕНКА
**ФОТАКАРЭСПАНДЭНТ**
Віталь ГІЛЬ
**ЮРЫСКОНСУЛЬТ**
Сяргей ГЕРАСІМЧЫК
**ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР**
Аляўціна СІДАРАВА
**БУХГАЛТАР**
Ганна ВАРАНОВІЧ
**ВЁРСТКА І ДЫЗАЙН**
Аляксей ГАРАЙНАЎ
Аляксей ВАРАНОВІЧ
**КАРЭКТАР**
Галіна КЛІНЦЭВІЧ
**АДДЗЕЛ ПАДПІСКІ І РАСПАЎСЮДЖВАННЯ**
**Загадчык:**
Анатоль ВАЛАДАШЧУК
**Супрацоўнік:**
Валерый КАРАБЕЙНІКАЎ

**Тэлефоны рэдакцыі:**
**2-14-39,**
**4-79-34**
**Наш адрас:**
**231800, г.Слонім,**
**вул. Камсамольская, 8.**


**e-mail:** gs@promedia.by
**http:**//gs.promedia.by

**ГРАФІК ПРЫЁМА РЭКЛАМЫ:**

**Панядзелак - пятніца**
з $9^{00}$ да $18^{00}$;
**Нядзеля**
з $11^{00}$ да $16^{00}$
**Выхадны — субота**

Апошні тэрмін падачы рэкламы ў чарговы нумар і ўнясення змяненняў у рэкламу
**Панядзелак — $18^{00}$**

**Менеджэр па рэкламе**
Ганна Валадашчук
тэл. **2-49-39**

**Падпісныя індэксы:**

***64042*** **(індывідуальная)**
***63818*** **(ведамасная)**
***63646*** **(льготная)**





**Падпісана да друку**
22 ліпеня 2003г.
Час падпісання 18:00.
Заказ № **2266**

**Надрукавана**
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня",
г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.
Аб'ём — сем друкаваных аркушаў